# Прыклады заданняў, выкарыстаных
# на ўроках беларускай мовы ў 5 класе

**І. М. Мядзведская,**
дырэктар Мішнеўскага вучэбна-педагагічнага комплексу
дзіцячы сад – сярэдняя школа Мсціслаўскага раёна,
настаўнік беларускай мовы і літаратуры
кваліфікацыйнай катэгорыі «настаўнік-метадыст»

**1.**

**2. Тэма:** Гукі беларускай мовы

***Перад вамі тэкст з кароткім паведамленнем пра пэўнае народнае свята. На месцы пропуску напішыце яго назву літарамі і гукамі і параўнайце іх колькасць.***

**М...** – апошняе свята года, абаронца ад грому. Унукі ў гэты дзень наведвалі сваіх бабуль. У народзс бытуе: да М... трэба выткаць адны кросны, другія – у Піліпаўку, трэція – у Мясаед, а чацвёртыя – у пост. Лічылася, што на М... мядзведзі ідуць у спячку. Назіраюць за надвор'ем: калі на сцёках лёд, то будзе ў пчалавода мёд.

***Адказ:*** *Міхайла (7) – [м'іхайла] (7). Колькасць літар і гукаў ва ўсіх словах аднолькавая.*

**3. Тэма:** Мяккі знак

*Запіс слоў пад дыктоўку на дошцы і ў сшытках:* ***мядзведзь, святкуюць, задобрыць, ушаноўваюць, дзень, кісель, любіць.***

***Чаму гэтыя словы сталі ў адзін радок?*** *(У канцы кожнага слова пішацца мяккі знак.)* ***Так, сапраўды. Але ёсць яшчэ адна прычына. Усе гэтыя словы звязвае беларускае народнае свята, свята пакланення мядзведзю – Камаедзіца.***

Пачатак свята бярэ ад дахрысціянскіх часоў. Святочны тыдзень пасля вясенняга раўнадзенства адзначаўся на прасторы ўсёй Усходняй Еўропы. Камаедзіцай завецца першы або апошні дзень гэтага тыдня.

Паводле павер'я, мядзведзь , які наводзіць страх на людзей, у гэты дзень абуджаецца ад спячкі. Продкі, каб задобрыць жывёліну, і прыдумалі звычай ушаноўваць яе.

У гэты дзень гатуюць асобную ежу: на першую страву – сушаны рэпнік у гонар таго, што мядзведзь харчуецца пераважна раслінным кормам, травамі; на другое падаецца кісель, бо звер любіць авёс; трэцяя страва складаецца з гарохавых камоў, ад якіх і само свята атрымала назву Камаедзіца.

***Якую назву можна даць тэксту? Складзіце план, з яго дапамогай вусна перакажыце тэкст.***

***Якія народныя святы вы яшчэ ведаеце, дзе адбывалася шанаванне жывёл?*** *(Каляды – каза, Саракі – птушкі, Благавешчанне – бусел)*

4. **Тэма:** Складаныя сказы з двума галоўнымі членамі ў кожнай частцы

***Адгадайце загадку. Падкрэсліце галоўныя члены ў складаных сказах.***

Прырода абуджаецца ад холаду і сну,
ярчэй засвеціць сонейка, чакаюць усе вясну!
У родны край з-за мора і высачэзных гор
лятуць кліны птушыныя, курлыкае прастор.
Якое сёння свята мы будзем сустракаць?
Чаму вясну патрэбна песнямі гукаць? (Саракі)

## Прыклады заданняў, выкарыстаных на ўроках беларускай мовы ў 6 класе

**1. «Карэктар».** ***Выпраўце памылкі ў формах прыметнікаў.***

Грамадскі арганізацыя «Ахова птушак Бацькаўшчыны» абвясціла жаўрука-смецюха птушкай 2017 года ў Беларусі.

Паводле інфармацыі арганізацыі, жаўрук-смяцюх – птушка не такая прыкметны, як яе папярэдніцы гогаль (птушка 2016 года) і вушасты сава (2015), але ўвагу да яе трэба выказаць вялікі: у Еўропе за апошнія 30 гадоў колькасць жаўрука-смецюха скарацілася на 95%. Важна не блытаць жаўрука-смецюха з іншымі жаўрукамі: палявы, баравы і рагаты. У Беларусі птушка знікае, яна занесена ў Чырвонаю кнігу.

Толькі разам мы можам дапамагчы жаўруку-смецюху стаць гаспадаром не толькі 2017 года, але і тых месцаў, дзе ён жыве шмат гадоў.

**2.** ***Прыдумайце і запішыце працяг тэксту. У складзеным вамі тэксце падкрэсліце прыметнікі.***

Аднойчы зімовым ранкам мне ў акно пастукаў дзюбкай маленькі верабейчык. Ён доўга скакаў па парэнчах балкона і не збіраўся адлятаць. Напэўна, быў вельмі галодны…

**3.** ***Выпішыце з песень кароткія прыметнікі.***

| **Картка 1 (1 варыянт)** | **Картка 2 (2 варыянт)** |
|---|---|
| **1.** Палосанька была і вузенька і караценька,<br>А цяпер стала і доўга і шырока.<br>І будзець стаяць някошана,<br>І будзець ляжаць няорана.<br><br>**2.** Сваты ў хату лезуць,<br>У печ паглядаюць:<br>– А чы густа капуста,<br>Чы вялік гаршчок кашы,<br>Чы паядаюць нашы?<br>– А паядаюць нашы,<br>Астанецца вашым. | **4.** Стаяла бяроза<br>Тонка да высока.<br>Гэй, гэй! Тонка да высока.<br>На корань глыбока,<br>На лісце шырока.<br><br>**5.** Да разгарэлася каліна,<br>Дробны іскаркі ронячы.<br>Расплакалася дзяўчыначка,<br>Перад бацькам стоячы.<br>Сунімаў татачка, не суняў,<br>Большай жаласці надаў. |

**4.** ***Паслухайце песню «Цячэ вада ў ярок», выпішыце кароткія і поўныя формы прыметнікаў разам з назоўнікамі.*** (Можна выкарыстаць песні «Ой, сівы конь бяжыць…», «Бывайце здаровы», «Купалінка».)

**Прыклады заданняў, выкарыстаных на ўроках беларускай мовы ў 7 класе**

1. **«Прапушчаныя словы».** ***Прачытайце тэкст пра Нацыянальную бібліятэку Беларусі, дзе згубіліся дзеепрыслоўі. Дапішыце патрэбныя словы.***

Будынак Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, ________ агранены дыямент, сімвалізуе каштоўнасць ведаў, прыгажосць і разнастайнасць свету. ___________ для карыстальнікаў у 2006 годзе, ён захапляе жыхароў і гасцей горада сваёй маштабнасцю. Нацыянальная бібліятэка, ___________ на сваіх паліцах шмат кніг і рукапісаў, стала інфармацыйным, навукова-даследчым і культурным цэнтрам. Перад фасадам будынка, _________ рукі да сонца і ________»Біблію», размяшчаецца бронзавая фігура беларускага першадрукара Францыска Скарыны.

У вячэрні час Нацыянальная бібліятэка Беларусі, ________ ў шматкаляро-вы экран з 65 тысячамі адценняў, прываблівае зрок многіх беларусаў.

**Словы для даведкі:** *ператвараючыся, узняўшы, нагадваючы, сабраўшы, трымаючы, адкрыўшыся.*

2. ***Знайдзіце «схаваны» ў тэксце фразеалагізм.***

Спакон веку тысячамі блакітных ніцей перасякаюць нашу Беларусь шматлікія ручаі, рэкі, рэчкі, рачулкі. Ды ёсць сярод іх адна, непаўторная, спрадвечная, летапісная, сапраўдны сімвал беларускай сталіцы. Аднак убачыць яе складана, праплысці немагчыма, а вось хадзіць па ёй можна хоць кожны дзень…